**Беларуская мова. 4 кл**

**Тэма: Назоўнік як часціна мовы**.

Настаўнік: Магілевіч З.В.

**Мэта:** Удакладніць і замацаваць веды вучняў аб назоўніку (змяненні па ліку і склону; вызначэнне роду назоўнікаў); развіваць творчыя здольнасці; уменне аналізаваць, прывіваць навыкі самастойнай работы; садзейнічаць выхаванню беражлівых адносін да прыроды, да сваёй радзімы.

**Ход урока**

**1. Арганізацыйны момант.**

Пачынаць любую справу патрэбна з добрага настрою. Створым добры, дружалюбны настрой. Усміхніцеся адзін аднаму, нашым гасцям.

Сядайце

- Рукі? (на месцы)
- Ногі? (на месцы)
- Локці? (з краю)
- Спіна? (прамая)
- Веды? (з сабою)

**2. Паведамленне тэмы і мэты ўрока.**

Калі веды з сабою, можна пачынаць урок.

Калі у небе санца свеціць

Або калі і дождж ідзе.

Давайце будзем, дзеці,

Ісці да новых ведаў кожны дзень.

За ведамі я запрашаю вас адправіцца ў падарожжа. Ці любіце вы падарожнічаць? Чаму? Адправімся мы ў горад, назву якога вам патрэбна адгадаць самім. (на дошцы запісаны два радкі слоў). Прачытайце словы ў кожным радку і знайдзіце лішняя слова. (дзеці выказваюць свае думкі). Да якой часціны мовы яны адносяцца? Значыць, наш горад будзе называцца як? "Назоўнік". Сёння мы ўспомнім веды, набытыя ў 3 класе, пра назоўнік (як вызначаюць род, лік, склон). Нас чакаюць цікавыя заданні, па-гэтаму вы павінны быць уважлівымі, добра працаваць і ў працы дапамагаць адзін аднаму. Веды, якія мы сёння паўторым, неабходны нам будуць на наступных уроках.

**3. Чыстапісанне.**

Пачнём наша падарожжа з запісу датыў сшытках. Запішам літару, з якой пачынаецца наша назва горада

Н на (хар. гука)

народ Нарач (растлумач. правапіс падкрэсл. літар)

Не спяшайся языком, а спяшайся справаю. (чаму стаіць такі знак прыпынку, растлум. прыказку)

**4. Паўтарэнне вывучанага матэрыялу.**

1. Каб трапіць нам у цікавы горад, неабходна прайсці "дзіўны" лес. Чаму ён дзіўны? (таму што на дрэвах растуць словы). А каб прайсці лес, трэба іх сабраць г. зн. запісаць словы, уставіць прапушчаныя літары і запісаць іх у два слупкі, у

залежнасці, на якое пытанне яны адказваюць. А так як мы ў лесе, успомнім правілы паводзін тут.

сцежка дзядзька
ягадкі воўк
землі мядзведзь
галлё вожык

два вучні працуюць каля дошкі (астатнія самастойна). Вучні тлумачаць, дзеці слухаюць.

Усім заданне: прыдумай сказ з любым назоўнікам.

2. І вось мы ў горадзе. І перш куды мы трапілі – гэта плошча Правіл. Сама назва гаворыць аб тым, што трэба ўспомніць правілы.

1. Што абазначае назоўнік?
2. На якія пытанні ён адказвае?
3. Калі назоўнік адказвае на пытанні хто? што?
4. Па чым змяняецца назоўнік?
5. Якога роду бывае назоўнік?
6. Як вызначаюць лік назоўнікаў?

Мы не раз яшчэ папрысутнічаем тут, на плошчы, а зараз нас жыхары горада запрашаюць на вуліцу "Весялінкіна" (прыдумваем роднасныя словы)

а) гульня "Не памыліся"

Я называю назоўнік, калі назоўнік адз. ліку, мы маўчым, калі мн. ліку – хлопаем у ладоні:

сасна, бяроза, віскі, заяц, птушкі, дзяўчынкі, нажніцы, хмара, сонейка, граблі, кніга, вясёлыя.

б) фізкультхв.

3. Весяліцца вы ўмееце, а зараз паглядзем, як вы ўмееце працаваць. Вяртаемся на плошчу правіл і адказваем на пытанне. Колькі склонаў ведаеце? Назавіце! Як вызначыць склон назоўніка? І зараз мы з вамі на вуліцы "Дружная". Чаму яна так называецца? А таму, што вы зараз і пакажаце, якія вы дружныя. Працуем ў парах. Заданне: Кожная пара павінна з палосак слоў скласці прыказку, запісаць яе ў сшытак, знайсці назоўнік і вызначыць склон. Зразумела? Працуем!

Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.
Адна пчала мёду не наносіць.

Якая прыказка падыходзіць да нашага задання, якое выконваем цяпер. Калі мы так гавырым? Як вы разумееце другую прыказку? А для вас Радзіма – гэта што?

Я думаю нам пара адправіцца на новую вуліцу. І як заўжды спынімся на плошчы правіл. Як вызначыць род назоўніка? І вось мы на вуліцы "Творчая". Мы пачалі гаварыць з вамі пра радзіму. А вось жыхары горада ніколі не чулі пра нашу краіну. Давайце раскажам ім, а для гэтага выканаем заданне.

1. скласці 3-4 сказы пра нашу Беларусь, обо пра вёску жодзішкі.
2. у дапамогу словы (рэкі, азёры, лясы птушкі, бусел, людзі, народ, гарады, вёскі).
3. спісаць верш з доскі.

Я жыву на Беларусі,

Дзе азёры і лясы.
Тут у нас гняздзяцца гусі
І гамоняць верасы.

Знайдзіце назоўнікі і вызначце род (5 наз.)

Я думаю наша падарожжа падышло к канцу. На ўсіх вуліцах мы пабывалі? А калі паглядзіш на карту, што яна вам напамінае? Не хапае некалькі пялёстачак або праменчыкаў. Значыць мы яшчэ не ўсё ведаем пра гэту часціну мовы. І вось на наступных уроках мы будзем далей вывучаць яе. І мы не раз пабываем у гэтым горадзе! А на заканчэнне, жыхары гэтага горада жадаюць вам нешта сказаць. Вы даведаецеся калі выканаеце тэст. Прачытаем заданне. Усё зразумела? Выконваем! Складзём літары, якое слова атрымалася? Маладзец.

Закрыйце вочкі. (гучыць музыка "Гукі прыроды")

Вас лашчыць сонечны праменчык, нешта шэпчыць ветрык, навокал усё светлае, роднае – наша Радзіма. Адкрыйце вочкі – вось мы і ў класе.

Спадабалася вампадарожжа? Што асаблівa? Дзе былі цяжкасці?

(ацэнванне вучняў)

**5. Заданне на дом. Ст. 83 пр. 138 або 4-5 сказаў пра падарожжа.**

**6. Рэфлексія.**

Калі вам спадабаўся ўрок, вам было цікава, добра на ўроку, прымацуйце васілёк пялёсткі, якога раскрыты, а калі вам было не цікава, то вазьміце васілёк, у якога пялёсткі яшчэ не